## № 108. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*9.V.1935 г.*

Дарагія і любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Сёньня прыехаў Нінін брат Мікола з Менску. Казаў, што Янка вярнуўся назад у Чэбаксары. А Ніна жыве на старым месцы, мае вельмі шмат вурокаў і шмат працуе. Менск за гэты час значна зьмяніўся.

Ад Н[ікалая] Паўл[авіча] адказу яшчэ не атрымаў. Дзіўна, чаму так доўга няма. Звычайна ён адказвае хутка.

Гэтымі днямі хаджу вечарамі на працу, заканчваю справаздачу.

Цалую Вас моцна.

Ваш *Адзік*.

## № 109. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*13.V.1935 г.*

Дарагія і любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Прывітаньне Вам ад Нік[алая] Паўл[авіча]. Учора прыйшоў ад яго ліст. Наконт магчымасьцяй атрымаць працу Н[ікалай] П[аўлавіч] піша, што бухгальтарскіх месц шмат, „але каб сказаць, ці ёсьць вольныя вакансіі, канечна, нельга, і мне думаецца, што работу знайсьці ўсё–ж можна, трэба толькі выждаць і быць у Анапе“. Наконт пэдагогічнай кажа, што ў гэтым абсягу адчуваецца вялікі недахоп. У Анапе ёсьць 10–годка з шматлікімі клясамі і ёсьць тэхнікум таксама шматлюдны. Што да ўстаноў і прадпрыемстваў, дык там ёсьць вялікі вінкамбінат, баваўняны завод. Шмат санаторый і дамоў адпачынку, курортная ўправа, МЖС, Гарпо, Горт і інш.

Пра кватэрныя магчымасьці піша, што там „яшчэ можна атрымаць кватэру на два пакоі за 40–50 р. на месяц, нават і за 30–35 р., але, вядома, ня ў цэнтры“. Летам, у часе сэзону, пакоі расцэньваюцца даражэй: у залежнасьці ад адлегласьці да цэнтру цана ад 60 да 250 на месяц, з абстаноўкай. Далей Н[ікалай] П[аўлавіч] дадае, што жывучы там, можна будзе атрымаць і жактаўскую кватэру, якія даюцца па меры іх аслабаненьня. Нарэшце, Н[ікалай] П[аўлавіч] выказвае сваю гатоўнасьць дапамагчы нам на першых парах з кватэраю. Ён піша: „З пісьма Вашага ня відаць, калі Вы можаце рушыцца з Кірава. Мне–б хацелася Вам дапамагчы на першых парах, г. зн. даць Вам памешканьне. Летам мае пакоі разьбіраюцца курортнікамі, а з месяца верасьня–кастрычніка, г[эта] значыць пасьля сэзону я з прыемнасьцю Вас устрою, даўшы Вам два пакоі, якія я звычайна на зіму не аддаю“.

Вось як бачыш, Анечка, самае галоўнае, бадай што, уладзіцца як найлепей, кватэра з восені будзе забясьпечана, і мы здолеем з верасьня м[еся]ца перабрацца на поўдзень. Ад Анапскага Горана адказу яшчэ няма. Я думаю напісаць цяпер запросы ў дзесяцёхгодку і тэхнікум, а таксама ў некаторыя ўстановы. Пішыце, як ты, Лорачка, здаеш іспыты? Цалую Вас моцна.

Ваш *Адзік*.